**Заключение.** Можно констатировать, что медийный образ Хакасии, создаваемый на страницах сибирских изданий, во многом был стереотипным, соответствовавшим требованиям времени и политическим критериям оценки успешного развития территории. Уделяя пристальное внимание вопросам хозяйства, промышленности и классовой борьбы, социальную жизнь людей данные газеты оставляли на информационной периферии.


1. Маркина, Ю.М. Имидж региона и региональная идентификация населения Дальнего Востока России: социологический анализ / Ю. М. Маркина: дис. … канд. соц. наук. – Хабаровск, 2010. – 163 с.
2. Рожков, И. Я., Кисмерешкин, В. Г. Бренды и имиджи / И. Я. Рожков, В. Г. Кисмерешкин. – М.: РИП Холдинг, 2006. – 256 с.
3. Варламова, И.В. Формирование современного образа республики средствами массовой информации Чувашии / И. В. Варламова: дис. … канд. филол. наук. – М., 2015. – 191 с.
4. Костякова Ю. Б. Телевизионные проекты как средство геоимиджирования (на примере ГТРК «Хакасия») / Ю.Б. Костякова // Аудиовизуальные медиа в условиях трансформации социокультурной среды : мат-лы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 5 апр. 2019 г. / Белорус. гос. унт ; редкол.: О. М. Самусевич (отв. ред.) [и др.] ; под общ. ред. В. Г. Булацкого. – Минск : БГУ, 2019. – С. 59–65.
5. Взрыв на черногорских копях // Красноярский рабочий, 1931 – №43. – С. 1.
6. Крупная авария // Красноярский рабочий, 1931 – № 178. – С. 3.
7. Чепурин, Н. Не милостыни и сожаления, а серьезного общественного внимания и поддержки ждут от нас слепые / Н. Чепурин // Красноярский рабочий, 1931 – № 29. – С. 4.
8. Бригада «СовСибири». В Хакасии работа по коллективизации ведется слабо // Советская Сибирь, 1931 – № 208. – С. 1.


## СТРАТЭГІЧНАЕ ЗНАЧЭННЕ ЛЯХАВІЦКАЙ ФАРТЭЦЫІ Ў ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ ПАЎНОЧНАЙ ВАЙНЫ


***Булаты П.Ю.,***

*малады навуковец, Інстытут менеджменту спорту і турызму,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*


Атрыбутам маёнткаў-рэзідэнцый у Вялікім Княстве Літоўскім з'яўляліся фартыфікацыйныя збудаванні. Актуальнасць даследавання абумоўленая тым, што прыватныя ўмацаванні ў маёнтках са статусам рэзідэнцый выконвалі ў тым ліку і абарончыя функцыі ў маштабах дзяржавы.

Мэта даследавання – акрэсліць ролю Ляхавіцкай фартэцыі ў баявых падзеях часоў Вялікай Паўночнай вайны (1700–1721 гг.).

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання з'яўляюцца апублікаваныя гістарычныя крыніцы і тэматычныя гістарыяграфічныя напрацоўкі. Метадамі даследавання з'яўляюцца наступныя метады: гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Ляхавіцкая бастыённая фартэцыя ўваходзіла ў агульную абарончую сістэму Вялікага Княства Літоўскага, знаходзячыся, паводле гісторыка М. Савіцкага, у глыбіннай лініі абароны дзяржавы на абшары паміж Дняпром і Нёманам [1, с. 288].

У перыяд Вялікай Паўночнай вайны баявыя дзеянні разгарнуліся і каля сцен Ляхавіцкай фартэцыі. Падчас яе патэнцыял і значэнне крэпасці былі выяўлены ў двух напрамках: у якасці рэсурснай базы для войска Вялікага Княства Літоўскага і ў якасці абараназдольнага ўмацаванага цэнтра.

Першапачаткова патэнцыял крэпасці ў Ляхавічах разглядаўся ў якасці базы для папаўнення рэсурсаў войска. Так, пастановай сойма 1703 г. было вырашана ўмацаваць армію Вялікага Княства Літоўскага артылерыяй і вайсковым рыштункам, якія знаходзіліся на ўзбраенні фартэцыі [2, с. 63]. 10 сакавіка 1703 г. па загаду польнага гетмана з Ляхавічаў у Слуцк было адпраўлена 5 гармат, а ў хуткім часе, 24 сакавіка, туды ж было накіравана яшчэ 14 гармат. Агульная колькасць вывезеных снарадаў living рознага калібру склала 1058 адзінак [3].

Але неўзабаве Ляхавіцкая фартэцыя была ўцягнутая ў баявыя дзеянні, дзе выявілася яе стратэгічнае вайсковае значэнне ўмацаванага асяродку. У 1706 г. шведскі кароль Карл XII дыслацыраваўся па блізу Гродна, дзе былі заблакаваныя асноўныя сілы расійскага войска. Другая яго частка на чале з царом Пятром І размяшчалася паабапал дарогі на Мінск. Хутка шведская армія адышла на зімовыя кватэры далей на ўсход. Блакада Гродна працягвалася, адначасова з тым шведы распускалі атрады для рабавання шляхты, якая была нелаяльнай шведскаму хаўрусніку каралю Станіславу Ляшчынскаму.



Репозиторий ВГУ

У сярэдзіне сакавіка 1706 г. шведскі кароль выслаў да Наваградка атрад падпалкоўніка Ёгана Рэйнгальда фон Траўтфэтара. Адной з галоўных мэт распачатага Карлам XII рэйду было спусташэнне маёнткаў князёў Радзівілаў і іх рэзідэнцыі ў Нясвіжы, што прымусіла б род шукаць замірэння са шведскім манархам і групоўкай магнатаў Вялікага Княства Літоўскага, якія яго падтрымлівалі. 23 сакавіка шведы былі ўжо пад Нясвіжам. На наступны дзень, разбіўшы казакоў у горадзе (але не чапляючы фартэцыі і яе абаронцаў), згодна з загадам Карла XII, падпалкоўнік адразу рушыў на Ляхавічы, каб разбіць размешчаны там гарнізон [4].

Да Ляхавіцкай фартэцыі шведы падышлі 25 сакавіка. Размешчаны тут казацкі аддзел не прыняў бой, а схаваўся ў крэпасці. Таму, не здолеўшы, як у Нясвіжы, знянацку разбіць казакоў і не маючы пяхоты для вядзення аблогі, Траўтфэтар адышоў ад Ляхавічаў і стаў у Крошыне, дзе чакаў прыбыцця пяхоты [4]. Аднак весці спусташальны рэйд, пакідаючы за спінаю Ляхавіцкі замак, было нельга. Абапіраючыся на непрыступныя ўмацаванні, гэтыя падраздзяленні маглі лёгка дзейнічаць у тыле шведаў, ствараючы ім значныя праблемы. У гэтым выявілася стратэгічнае значэнне ляхавіцкіх умацаванняў: стрымліванне і перашкода камунікацыям войск непрыяцеля.

Агулам, гарнізон Ляхавіцкай фартэцыі на момант асады ў 1706 г. налічваў больш 1500 жаўнераў. Большую яго частку складалі казакі пад камандаваннем Пераяслаўскага палкоўніка Івана Міровіча. Таксама ў Ляхавічах знаходзілася некалькі соцень жаўнераў палка Вандаліна Мнішака, якімі камандаваў падпалкоўнік барон фон Мюнхаўзен. З артылерыі ў абаронцаў было 9 рознакаліберных гармат [5].

Дзеля стрымання гарнізона шведскі кароль накіраваў пад Ляхавічы палкоўніка Карла Кройца, загадаўшы яму сабраць разам раскіданыя ў наваколлі аддзелы і ўзяць замак у аблогу. Агулам пад сцены Ляхавіцкай крэпасці шведскі вайскаводзец прывёў каля 1500 кавалерыстаў, некалькі атрадаў наёмнікаў, якіх размясціў у горадзе, і надзейна перакрыў падыходы да асаджанага гарнізона.

Як толькі ў расійскім корпусе гетмана Івана Мазепы, які ўяўляў галоўную небяспеку для Кройца, стала вядома пра блакаду Ляхавічаў і канцэнтрацыю шведскіх войскаў, было вырашана скарыстацца гэтай сітуацыяй. На дапамогу ляхавіцкаму гарнізону з Мінска ў канцы красавіка рушыла расійскае войска на чале з Сямёнам Няплюевым, да якога далучыліся казакі са Слуцка. Шведскі палкоўнік Кройц загадзя атрымаў інфармацыю аб набліжэнні ворага і, пакінуўшы невялікую частку войска на чале з Траўтфэтарам для далейшай аблогі Ляхавіцкай крэпасці, уначы 29 красавіка выйшаў з лагера насустрач непрыяцелю. А пятай гадзіне раніцы наступнага дня шведы атакавалі расійска-казацкае войска, што спынілася пад Клецкам, і разбілі яго [6].

Вестка аб паразе войска, якое ішло на дапамогу, негатыўна паўплывала на маральны стан гарнізона, які знаходзіўся ў аблозе. І ў рэшце 1 мая 1706 г. камендант Ляхавіцкай фартэцыі адкрыў браму шведам.

Падзеі вясны 1706 г., якія разгарнуліся ў Ляхавічах, падкрэслілі значэнне крэпасці. Так, маючы колькасную перавагу і пакуль трымаўся гарнізон Ляхавіцкай фартэцыі, гетман Мазепа меў магчымасць схіліць шалі на свой бок, разграміць атрад Кройца і ўтрымаць стратэгічна важныя ўзмоцненыя асяродкі абароны. Валоданне крэпасцямі з'яўлялася значнай перавагай у ходзе вайны. Але пасля разгрому пад Клецкам і капітуляцыі Ляхавічаў, шведы адразу завалодалі крэпасцямі ў Нясвіжы і Слуцку. Тры магутныя фартэцыі з велізарнымі запасамі і арсеналамі аказаліся ў руках Карла XII. Не маючы небяспекі ў сваім тыле, шведскі кароль працягнуў рух войска на поўдзень.

Хоць кампанія на Наваградчыне праходзіла ў баку ад асноўнага тэатра баявых дзеянняў, падзенне Ляхавіцкай крэпасці і перамога шведаў мелі вялікі інфармацыйны розгалас. Так, падзеі вясны знайшлі сваё адлюстраванне ў тагачаснай шведскай перыёдыцы [7].

**Заключэнне.** Уваходзячы ў агульную абарончую сістэму ВКЛ, прыватная Ляхавіцкая бастыённая фартэцыя выконвала ўскладзеныя на яе функцыі. Знаходзячыся на важным стратэгічным напрамку, гарнізон крэпасці перашкаджаў руху непрыяцельскіх войск. Падзеі Вялікай Паўночнай вайны паказалі, што толькі завалодаўшы Ляхавіцкай фартэцыяй, нават калі яна знаходзілася далёка ад галоўнага тэатра баявых дзеянняў, можна было весці паспяховую кампанію і перасоўваць войскі. Узбраенне Ляхавіцкай фартэцыі пры неабходнасці з'яўлялася рэсурсам для арміі Вялікага Княства Літоўскага.

1. Савіцкі, М. Прыватная фартэцыя Радзівілаў у Біржах у XVIII стагоддзі. Артылерыя і цэйхгауз / М. Савіцкі // ARCHE Пачатак. – 2014. – № 6. – С. 288–304.

Репозиторий ВГУ

2. Volumina Legum : w 10 t. – SPb., – 1859–1860. – T. 6. – 1860. – 208 s.
3. Archiwum Giywne Akt Dawnych. – Archiwum Radziwillyw. Dz. VII. S.646.
4. Волкаў, М. Нясвіжскі замак у Вялікай Паўночнай вайне / М. Волкаў // Вялікае Княства Літоўскае: Права. Вайна. Дыпламатыя. – Мінск : БІП – Інстытут правазнаўства, 2012. – С. 219–238.
5. Оглоблин, Д. Бой со шведами у местечка Клецка / Д. Оглоблин // Русская старина : [в 174 т.]. – СПб., 1891. – Т. 72. – С. 25–32.
6. Блінец, А. У. Клецкія бітвы: 1506 і 1706 гады / А. У. Блінец. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2015. – 130 с.
7. Ordinarie Stockholmiske Posttidender. – 1706. – № 23.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ДВАРА СТАНІСЛАВА АЎГУСТА: ЯГО АСАБЛІВАСЦІ, СТРУКТУРА І ЗНАЧЭННЕ

***Васілюк Н.І.,***
*студэнтка 4 курса ГрДУ імя Янкі Купалы, г. Гродна, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Марозава С.В., доктар гіст. навук, прафесар*

Артыкул актуальны таму, што ў беларускай гістарыяграфіі няма ніводнага даследавання, прысвечанага двару С.А. Панятоўскага. У сувязі з гэтым неабходна прааналізаваць яго структуру, асаблівасці, а таксама прасачыць за абавязкамі і паўсядзённым жыццем прыдворных.

Мэта – вызначыць асаблівасці, структуру, значэнне двара, абазначыць яго ролю ў жыцці манарха, дакладна прааналізаваць прыдворнае акружэнне караля**.**

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання паслужылі ўспаміны і запісы набліжаных да манарха асоб, мемуары самога Станіслава Аўгуста Панятоўскага, а таксама дакументы, якія ўключаюць у сябе факталагічную інфармацыю. Падчас даследавання былі выкарыстаныя агульнанавуковыя метады даследавання (аналіз, сінтэз, абагульненне, параўнанне, індукцыя і дэдукцыя) і спецыяльныя гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-кампаратыўны).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Каралеўскі двор – паняцце вельмі шырокае, разнастайнае, але, на жаль, у беларускай гістарыяграфіі амаль не распрацаванае. Даследчыкі заўсёды надавалі шмат увагі гаспадару двара – самому манарху, яго поглядам і палітычным намерам, але амаль не цікавіліся людзьмі, якія яго акружалі – прыдворнымі. Дык вось, двару Станіслава Аўгуста Панятоўскага, на жаль, таксама прысвечана вельмі мала даследаванняў. У артыкуле даецца агульная характарыстыка т. зв. прыдворнага грамадства пры Станіславе Аўгусце, іх статусу і абавязкаў, аналізуюцца прынцыпы аднясення прыдворных да таго ці іншага рангу і паказчыкі статусу прыдворнай асобы.

Усё акружэнне апошняга манарха Рэчы Паспалітай мы можам падзяліць на некалькі ўмоўных груп, зыходзячы з розніцы падыходаў да ацэнкі той ролі, якую яны адыгрывалі пры асобе Панятоўскага. Усё прыдворнае акружэнне можна падзяліць па блізкасці ці далёкасці ад манарха ці па статусе пры двары. Найбольш высокі грамадскі статус звычайна мелі прыяцелі і кроўныя родзічы, якія нярэдка выступалі і даверанымі асобамі Станіслава Аўгуста. Потым ішлі г.зв. афіцыялісты – набліжаныя слугі, якія займалі прыдворныя ўрады пры асабістым двары караля, але, як правіла, не трымалі дзяржаўных ці павятовых урадаў (сакратары, вялікі надворны канюшы, каралеўскі доктар, кухмістр, падскарбій). Наступныя групы складалі “слугі дворныя” (скараход, бібліятэкар, падчашы і інш., у асноўным прыслуга сярэдняга рангу), розныя спецыялізаваныя службы (стаенная, кухонная і інш.) і чорная чэлядзь (палацёры, чарнарабочыя і інш.) [4, с. 26].

Так званы статус, ці ранг, які набываў прыдворны, залежаў ад яго паходжання і пасады, якую ён займаў. Увогуле паступленне на каралеўскую службу альбо пратэкцыянавалася сваякамі, альбо пры іх адсутнасці з'яўлялася следствам прызнанага каронай прафесіяналізму саміх намінантаў [1]. Існавалі наступныя паказчыкі статусу прыдворнай асобы: удзел у цырыманіяле, знешні выгляд, месца пражывання.

Двор – гэта мноства асоб з асабістымі жаданнямі. Асноўная мэта караля – усталяваць над прыдворнымі жорсткі кантроль і не дазволіць ім злучыцца супраць сябе [6, с. 124]. Дык вось, *цырыманіял* для прыдворных і для манарха служыў жаданнем паказаць свой аўтарытэт. З яго дапамогай Станіслаў Аўгуст кантраляваў адносіны паміж эліты. Этыкет з’яўляўся інструментам не толькі дыстанцыравання, але і панавання [6, с. 125]. Яшчэ адным паказчыкам з’яўляўся *знешні выгляд* прыдворнай асобы. Як вядома, адзенне нясе ў сабе мноства функцый. Зразумела, што прывеліяваныя асобы пры двары не дазволілі б сабе насіць адзенне, якое шпэціла б іх прэстыжу. Дзеля гэтага яны заўсёды абіралі сабе касцюмы і сукенкі з каштоўнай тканіны, дзякую-

Рэпазіторый БГУ